УДК 378.035.6:808.26

В. К. Мароз, канд. філал. навук, дацэнт

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ФАКТАР ІДЭАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ

The article shows that the Belarusian language have to be necessarily presented in the ideological education as an obligatory component.

Беларускую мову ў якасці фактара ідэалагічнага выхавання можна разглядаць як у кантэксце ўмацавання нацыянальнага дзяржаўнага суверэнітэту, так і ў межах тых вучэбна-выхаваўчых задач, якія вырашаюць вучэбныя дысцыпліны «Беларуская мова», «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы», «Гісторыя Беларусі», «Культуралогія», «Філасофія» і інш.

Паколькі ідэалогія адлюстроўвае навукова-тэарэтычны ўзровень грамадскай свядомасці як сістэму рацыянальна і лагічна абгрунтаваных тэарэтычных канцэпцый, ідэй і поглядаў пра сутнасць грамадскага ладу і яго ідэалы, варта засяродзіць увагу студэнтаў, што на сучасным этапе беларускае грамадства сярод такіх прыярытэтаў, як *правы чалавека, дзяржаўнасць, каштоўнасці ўласнай гісторыі, нацыянальных традыцый, звычаяў, агульначалавечыя ідэалы дабра, праўды, справядлівасці*, далучае ў якасці абавязковага кампанента ***каштоўнасць нацыянальнай (роднай народу) мовы***. Паняцце *каштоўнасць* у структуры ідэалагічных кампанентаў *(веды, нарматывы, перакананні, дзеянні, воля*) адлюстроўвае чалавечае, сацыяльнае і культурнае значэнне пэўных з'яў рэчаіснасці. Такая сістэма каштоўнасцей сфарміравалася гістарычна і павінна быць асэнсавана сучаснікамі і перададзена нашчадкам. І надзвычай важна, каб вызначальнае месца ў сістэме сучасных ідэалагічных каштоўнасцей, скіраваных на выхаванне патрыётаў беларускай дзяржавы, належала нацыянальнай мове. Бо беларуская мова выступае не толькі сама па сабе як найважнейшая нацыянальная каштоўнасць, але з'яўляецца і галоўным сродкам тварэння нацыянальнай гісторыі і культуры. Беларуская мова – родная мова беларускага народа, духоўны скарб народнай душы: «*Для мовы, гэтай выразіцелькі душы і думак чалавека, не патрэбна ні скіпетраў, ні каронаў, як не патрэбна для сонца якога-небудзь яшчэ пазалочанага абруча, рамак. Сонца само па сабе адна аздобнасць – і золата, і брыльянт. Таксама і мова якога-небудзь народа з'яўляецца для яго і скіпетрам, і каронай, яго нічым не апаганенай аздобнасцю*» (Янка Купала. Ці маем мы права выракацца роднай мовы). Беларуская мова, знаходзячыся ў стане нацыянальнага адраджэння, на сучасным этапе аб'ектыўна патрабуе прыярытэтнага развіцця такіх функцый, як пазнавальная і камунікатыўная.

Такім чынам, беларуская мова, з'яўляючыся галоўным фактарам фарміравання ўсіх духоўна-інтэлектуальных каштоўнасцей у сферы адукацыі, нацыянальнай культуры, сістэмы інфармацыі, можа забяспечыць паступальны шлях нацыі ў будучыню. Высокі статус дзяржаўнай беларускай мовы, замацаваны ў Канстытуцыі і Законе аб мовах, павінен быць развіты ў сістэме ідэалагічнага выхавання праз адзін з асноўных кампанентаў ідэалогіі – патрыятызм. Ён грунтуецца на ідэях, пачуццях і дзеяннях, якія маюць у аснове любоў і аддансць Радзіме. У беларускай духоўнай культуры патрыятызм як маральна-палітычны прынцып, зместам якога з'яўляецца любоў да Радзімы і ўсяго роднага, айчыннага, вядомы з глыбокай старажытнасці. Высокі ўзровень патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў праявіўся пад час перапісу 1999 г. *Роднай моваю* прызналі беларускую мову 85,6% з ліку 81,2% беларусаў; болей за 40% ад гэтай колькасці сцвердзілі, што *карыстаюцца беларускаю моваю як формаю зносін кожнадзённа.* І гэта, нягледзячы на тое, што ў 90-я гг. XX ст. у Беларусі склалася сітуацыя афіцыйнага двухмоўя, якая выклікала звужэнне сферы выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця: адукацыйнай, інфармацыйнай, справавой, навуковай, культурнай. Адносіны да беларускай мовы ў Беларусі істотна змяніліся на карысць беларускай мовы пасля прыняцця Закона «Аб мовах у Беларускай ССР» (1990 г.) і надання беларускай мове статуса дзяржаўнай. Яны да сёння захоўваюць устойлівы характар, у чым можна пераканацца, прааналізаваўшы вынікі двух апошніх перапісаў: у 1989 г. 80,2% беларусаў лічылі беларускую мову роднаю, а ў 1999 г. – 85,6%. Родная мова – гэта сістэма, адметная ад суседніх ці іншых моваў, якую пэўны народ самаідэнтыфікуе як сваю ўласную, надзвычай дарагую і каштоўную спадчыну, неад'емную ад гісторыі краю: «*Родная мова ў дакладным значэнні ёсць самая любімая спадчына нацыі: праз яе найлягчэй пранікнуць у душу нацыі, закрануць пачуцці, праясніць розум, падштурхнуць адпаведную думку, заклікаць да дзеяння, змагацца са страсцямі, ствараць дабрачыннасці*» (Аляксандр Ельскі, беларускі этнограф, пісьменнік, эканаміст XIX ст.). Беларуская мова была і застаецца на нашай зямлі роднай моваю беларусаў. Яна трымае нас разам, цэментуе беларускую нацыю.

У сістэме сродкаў ідэалагічнага ўплыву формай пераходу ад ведання да практыкі выступае перакананне. Перакананні – гэта форма паглыблення, укаранення ведаў і каштоўнасцей у сістэму светапоглядаў, вера чалавека ў правату засвоеных ідэй. Фарміраванне перакананняў на аснове ведаў, веры і сістэмы каштоўнасцей немагчымае без найважнейшага кампанента – валявога. Воля – гэта здатнасць ці гатоўнасць рэалізаваць засвоеныя веды, каштоўнасці, ідэалы ў практычнай дзейнасці. Бязволле, сацыяльнае раўнадушша, абыякавасць, разыходжанне ўчынкаў з ведамі і каштоўнасцямі, што чалавек нярэдка дэманструе толькі на словах, не забяспечваюць дзейснага светапогляду, грамадзянскай пазіцыі. Ідэалагічнае выхаванне можа значна паспрыяць замацаванню ў свядомасці сучаснай беларускай моладзі самакаштоўнасці нацыянальнай мовы праз развіццё *валявога кампанента*, які дапаможа развіць здольнасць ці гатоўнасць увасобіць засвоеныя веды, каштоўнасці, ідэалы ў практычнай дзейнасці. Такім чынам, ідэалагічнае выхаванне мае на мэце фарміраванне наступнай сістэмы перакананняў:

сучасная беларуская літаратурная мова здольная паўнавартасна функцыянаваць у межах нацыі як поліфункцыянальная сістэма (як мова адукацыі, навукі, культуры, справаводства;

толькі на беларускай гістарычнай тэрыторыі беларуская мова можа адрадзіцца ў якасці паўнавартаснага сродку камунікацыі;

нацыянальнае адраджэнне беларускага народа немагчымае без адраджэння беларускай мовы;

грамадзянскі абавязак і патрыятычны клопат беларускай моладзі павінен быць скіраваны на няўхільнае пашырэнне беларускай мовы ў пазнавальнай і камунікатыўнай сферах;

кожны грамадзянін Беларусі павінен валодаць вуснай і пісьмовай формамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы (умець лагічна выказваць уласныя думкі, правільна і дакладна перадаваць засвоеную інфармацыю, кваліфікавана перакладаць з іншых моваў на беларускую мову).

Агульнапрызнана: у фарміраванні беларускай нацыянальнай свядомасці, адраджэнні духоўнай культуры беларусаў выключную ролю мела *літаратура*, якая вызначыла каштоўнасныя арыенціры беларускай нацыі – у прыватнасці, ***каштоўнасць уласна мовы***. У ідэалагічных падыходах да праблемы мовы асаблівая ўвага павінна надавацца творчай спадчыне класікаў беларускай літаратуры. Багацце беларускіх афарыстычных (крылатых) выразаў дапамагае засяродзіць увагу грамадскасці на сутнасных праблемах сучаснага быцця нацыянальнай супольнасці: «*Дзякуй тым, хто нашу мову родную ўскрашае!*», *«Роднаму слову ўмеў кніжны даць ход»; «Выракацца роднай мовы не маем права»; «Бяссмертнае слова, ты, роднае слова!»* (Янка Купала); *Жывы народ, пакуль жывое слова. // Крыніцаю...з-пад глею і жарствы // Адродзіцца праз ваш ратунак мова – // Адродзіцеся з роднай мовай вы!* (Мікола Пракаповіч).

Ідэалогія ў абагульненай форме выражае сістэму поглядаў, уяўленняў і ідэй пра асновы сацыяльна-палітычнага ўладкавання грамадства. Гэтак і светапогляд уяўляе сабой сістэму поглядаў на свет і месца чалавека ў ім. Таму нельга дапускаць падмены грамадскага дыялогу па асноўных аспектах фарміравання нацыянальнай ідэі ідэалагічнымі пасажамі, дзе сутыкаюцца не навуковыя погляды, а палітызаваныя погляды і ўяўленні. Толькі асэнсаванне вытокаў і спецыфікі нацыянальнай культуры і беларускага этнасу, гістарычная спадчына беларускай нацыі, яе самасцверджанне ўплываюць на фарміраванне нацыянальнай ідэі як крыніцы духоўнага ўзбагачэння, грамадзянскага яднання і нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі.